ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 "
6 месяцаў . . . 1 р. 80 "
1 год . . . 3 р. 60
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 3
Тэлефоны: рэдактара—7-25
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 213 (1482) || НЯДЗЕЛЯ 13 верасьня 1931 г.

У роспачы дзікай скрыгаюць турмы Над белай трупярняй—Варшавай

Крыльлем мяцежным па гранях вякоў

Словы песень няволі мяцежнай,
Ахвярэлы лямант і рогат
Б'юцца крыльлем аб грані парогаў,
Сэрца цьвёрдай рашучасьцю рэжуць.

Гэта ў схватах сьмяротных агоній
Фашысцкая „слаўная" Польшча
На чорных кварталах і гонях
Стан свой крывёю палошча.

Як зьвер праз балоты ў хвойнік,
Ноччу выходзіць на рубяжы,
Пра новыя, страшныя войны
На картах гадоў варажыць.

Як павільёны багатай „культуры"
Голкамі кратаў іржавых
У роспачы дзікай скрыгаюць турмы
Над белай трупярняй—Варшавай

Лукішкі—электростанцыі Вільні
Рэволюцый сусьветных ток
Скора ўключыць рубільнік
У мускулы, сэрца працоўных братоў.

Выйдзем тады мы сілаю грознай
Нястрымным, магутным разводзьдзем
За тысячы ахвяраў, за сьлёзы
Рашучы рахунак падводзіць!

Паўкі, сьцены, сталы пастарункаў
Прад'явіць тысячы неаплачаных
рахункаў
Узьняты бор лапатак, віл, вінтовак
Прыпомніць ахвяры доўгіх галадовак.

Раскажа кожнае гумно і гай, як
Паміраў чалавек у сьвістах нагаек.

Не адзін маёнтак, палац
У адплату будзе палаць!
І ўсьміхнуцца Савецкім днём нам
Прасторы над сінім Дунаем і Нёманам!

М. САЙКОЎСКІ.



Дэфіцыт у адзін месяц—13,4 млн. злотых

ВАРШАВА. 9. Дзяржаўны бюджэт Польшчы на жнівень, зноў зьведзены з дэфіцытам у 13,4 млн. злотых (злоты—больш 20 кап.).

Польскі ўрад мае намер прыступіць да новага скарачэньня пэнсіі дзяржаўным служачым.

Далёка ідучая провокацыя

ВАРШАВА. 10. Рэакцыйны часопіс—„Ілюстраваны кур'ер цодзенны"—публікуе ў выглядзе сэнсацыі артыкул, які абвінавачвае афіцыйныя ўлады Нямеччыны ў тым, што яны арганізавалі і забясьпечылі грашыма падпольны ўкраінскі рух.

У выглядзе дакумэнта, які нібыта пацьвярджае гэтыя абвінавачваньні, газэта зьмяшчае фотоздымкі двух лістоў, напісаных па словах часопісу, двума работнікамі нямецкага міністэрства замежных спраў, якія сьведчаць аб існаваньні, як быццам, сувязяй паміж міністэрствам замежных спраў Нямеччыны і нямецкім ваенным міністэрствам з аднаго боку і тэрорыстычнымі ўкраінскімі організацыямі Польшчы—з другога боку.

Часопіс зьвяртаецца да левых нямецкіх партый з заклікам патрабаваць у бліжэйшыя сэсіі рэйхстагу організацыі спэцыяльнай камісіі для расьсьледваньня гэтых абвінавачваньняў.

У „дэмократычнай" Мэксыцы

Беспрацоўны ня маючы памяшканьня для жыцьця сьпіць на тратуары.

„60 проц. рабочае моладзі Заходняй Беларусі кінута на галоднае выміраньне"

Глыбокі экономічны крызіс, окупацыйная політыка польскага фашызму, нацыянальны ўціск і жудасны тэрор—усё гэта непасільным цяжарам легла на плечы працоўных Заходняй Беларусі і галоўным чынам на моладзь.

У пагоні за найбольшай нажывай, прыбыткам капіталістыя бязьлітасна экспляатуюць рабочую моладзь, уводзячы на ўсе фабрыкі і заводы мэтады капітал стычнай рацыяналізацыі.

Дзякуючы капіталістычнай рацыяналізацыі на вуліцу выкідаюцца дзесяткі сотень дарослых рабочых, а ўзамен іх набіраюцца падлеткі, бо па існуючаму закону іх праца падлеткаў у параўнаньні з працай дарослых рабочых аплачваецца ў 3-4 разы менш.

Цэхавы закон гэта адна з форм наймацнейшай экспляатацыі: 4 гады падлетак амаль бясплатна, галодны выконвае цяжэйшую работу на гаспадара. Напрыклад у Вільні падлеткі ў краўцоў працуюць 16-18 гадзін у суткі; у шаўцоў 14-16 гадз., у пекараў 12-14 і г. д.

Зарплата жабрацкая: ад 3 да 5 злотых у тыдзень. Але часта моладзі прыходзіцца працаваць зусім бясплатна, а нават часамі яшчэ і даплачваць сваімі грашыма за так званую „практыку".

Фашысцкі ўрад увёў цэхавы закон, каб задушыць клясавую барацьбу моладзі, каб адняць магчымасьць організавана выступаць супроць экспляататараў-капіталістых. Гаспадарча-экономічны крызіс спыніў дзейнасьць фабрык і заводаў Вільні, Горадні, Беластоку і інш. буйных прамысловых цэнтраў. Армія беспрацоўных з кожным днём і гадзінай надзвычай шпарка павялічваецца.

60 проц. моладзі Заходняй Беларусі зьяўляецца беспрацоўнай, яна пазбаўлена дапамогі, кінута на галоднае выміраньне.

Дарэмна ў адчайнай безнадзейнасьці ідзе яна на біржу працы, прапануючы сваю рабочую сілу.

Становішча бядняцка-батрацкай моладзі ня лепшае асабліва з наступленьнем восені. Бедняку прыходзіцца думаць, як аддаць усе тыя чыншы і падаткі, якія наклад е абшарнік. Напрыклад: гаспадарка з 8 дзесяцін зямлі павінна заплаціць чыншу каля 100-150 злотых, бядняцкая гаспадарка ў 1 з пал. дзесяціны—50-75 злотых. Акрамя таго, яшчэ цэлы рад іншых падаткаў дзяржаўныя, комунальныя, соймавыя, страховыя, даходныя і інш. Цэлы рад штрафаў: коміны не пабелены, сабака ня прывязана, дуга без званка—штраф і штраф.

А з „шарваркаў" селянін і ня вылазіць: масты, дарогі, канавы—усё гэта павінен выпраўляць і будаваць селянін бясплатна, ў парадку „грамадзкасьці".

Працоўныя сяляне ўсё больш і больш руйнуюцца, з году ў год павялічваючы суму пазык, нядоімак, процантаў...

Батрацтву, пасьля доўгіх пошукаў работы ў абшарніка ці кулака, прыходзіцца працаваць з раніцы да позьняга вечару за 20-40 грошай (8 кап.) у дзень.

Нацыянальна гаменьне на родную мову беларусаў, на іх культуру, школы, культ-асьветныя ўстановы набыло шырокі размах.

Працоўныя Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ вядуць рашучую барацьбу супроць польскага фашызму.

Для ўціхамірваньня непаслухмяных сялян „бунтаўшчыкоў" высылаюцца карныя экспэдыцыі, якія зьверствамі і мерамі пакараньня нічым не розьняцца ад сярэднявечных інквізыцый. Палаюць дамы, сёлы, зьбіваюцца да паўсьмерці сяляне

> Комсамол Заходняй Беларусі пад кіраўніцтвам сваёй компартыі мобілізуе вакол сябе масы працоўнай моладзі на штодзённую барацьбу з ненавісным, крывавым фашызмам. Праводзіцца ў гарадох цэлы рад забастовак, дэмонстрацый супроць абнаглеўшага фашызму, за павялічэньне зарплаты, скарачэньне рабочага дня, зьніштажэньне штрафаў, за выдачу дапамогі беспрацоўным, супроць цэхавага закону і г. д.

Так, на працягу чэрвеня і ліпеня тысячы беспрацоўных у Вільні дэмонстравалі супроць тэрору, за хлеб і работу, змагаліся з паліцыяй, закідаўшы яе каменьнем.

У Беластоку, наперакор уговорам кіраўнікоў ППС, забаставалі ўсе тэкстыльшчыкі ў адзнаку сваёй солідарнасьці з рабочымі фабрыкі Потржэбуцкага, дзе была скарочана зарплата. Шляхам магутнага напору дэмонструючых тэкстыльшчыкаў, а іх было больш за 2 тысячы, рабочыя атрымалі перамогу над фабрыкантамі.

У Горадні, у адказ на зьніжэньне фабрыкантамі зарплаты, выбухла забастоўка магістральных служачых, рабочых электростанцыі і водаправоду, з якімі солідарызаваліся рабочыя дзяржаўнай—тытунёвай фабрыкі. Ня гледзячы на тое, што былі акружаны салдатамі і паліцыяй, рабочыя атрымалі перамогу.

Па вёсках таксама пракацілася магутная рэволюцыйная хваля. Напрыклад, у мястэчку Азанах, Баранавіцкага павету, сяляне ў барацьбе з ненавіснай польскай фашысцкай окупацыяй узяліся за зброю. Налецеўшая азьвярэлая паліцыя ўчыніла самасуд, рабункі і зьдзекі. У сутычцы з узброенымі сялянамі забіты комэндант паліцыі Касінскі.

У адну з вёсак Харашанськай гміны (Беласток) напярэдадні 1-га Мая наехала шмат пераапранутых шпікоў і паліцэйскіх з мэтай разагнаць дэмонстрацыю. Сяляне, узброеныя каменьнямі, палкамі, хто чым папала, організавана накінуліся на іх і прагналі з вёскі, многіх пры гэтым параніўшы.

У вёсцы Заполье (Навагрудчына) урад забараніў адчыніць беларускую школу, у адказ на гэта 100 чал. вучняў вышлі на дэмонстрацыю протэсту з чырвоным сьцягам, дзе было напісана:

— „Далоў фашызм, патрабуем беларускай школы".

У напаўшых некалькіх паліцэйскіх пасыпаліся каменьні, якія зрабілі сваё дзеяньне, і паліцыі прышлося ўбрацца.

Працоўная моладзь організавана выступае ў абарону свайго роднага „Таварыства Беларускай Школы" і не бяз вынікаў.

Пад правільным комуністычным кіраўніцтвам КПП і КПЗБ пролетарыят Заходняй Беларусі прыдзе да перамогі!

В. БУЙНІЦКІ.

Хто больш і лепш працуе, той больш і атрымае

Правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў у колгасе мае рашаючае значэньне для выкананьня дырэктыў партыі аб організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў.

Правільна разьмеркаваўшы прыбыткі колгасу не па едаках, а па колькасьці і якасьці работы кожнага колгасьніка, мы даем стымул гаспадарчай зацікаўленасьці колгасьнікаў, іх актыўнасьці і самадзейнасьці ў выкананьні гаспадарчых плянаў.

Пастанова НКЗБ і Колгасцэнтру аб разьмеркаваньні ў колгасах даходаў 1931 году павінна стаць выходным пунктам конкрэтнай барацьбы комсамолу за організацыйна гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў.

Рашуча змагаючыся з кулацкім ядоцкім прынцыпам і дробна-буржуазным прынцыпам „ураўнілаўкі" пры разьмеркаваньні ўраджаю і прыбыткаў, комсамольскія ячэйкі павінны разгарнуць масавую работу па растлумачэньню колгасьнікам рашэньняў партыі і ўраду аб разьмеркаваньні ўраджаю на аснове ўліку колькасьці і якасьці працы кожнага колгасьніка. Нарэшце, трэба дабіцца, каб не пазьней 15-га студзеня 1932 году скончыць ва ўсіх колгасах поўнае разьмеркаваньне прыбыткаў.

Разам з гэтым комсамольскім ячэйкам колгасаў трэба рашуча змагацца за павялічэньне непадзельных фондаў, шырока растлумачыць кожнаму колгасьніку, што з агульнага даходу колгасу робіцца адлічэньне насеннага, страхавога фонду і запаснога фонду,—сум, якія павінны пайсьці на выплату сельска-гаспадарчага падатку, страхоўкі і плацяжоў па крэдытах 1931 году.

Пасьля паказаных адлічэньняў з сумы даходаў ствараецца непадзельны фонд, фонд для разьмеркаваньня паміж колгасьнікамі па кошту аграмаджанай маемасьці, культурна-бытавы фонд, прэміяльны фонд і фонд для аграрвытворчага абслугоўваньня колгасаў". Толькі такі парадак разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў у колгасе забясьпечыць далейшы яшчэ больш пасьпяховы рост колгаснай гаспадаркі і палепшыць матэрыяльна-культурныя ўмовы колгасьнікаў.

Каб забясьпечыць разьмеркаваньне прыбыткаў у колгасе на аснове прынцыпу „хто больш і лепш працуе, той больш і атрымае" і каб к паказанаму ў пастанове НКЗБ і Колгасцэнтру тэрміну скончыць гэтую работу, комсомольскія ячэйкі абавязаны зараз-жа правіць максімум ініцыятывы ў тым, каб скончыць падлік працадзён кожнага колгасьніка, падлік вынікаў ураджаю і ўсіх прыбыткаў колгасу за 1931 год. Кожная комсамольская ячэйка абавязана даць у колгасы на гэтую работу ня менш двух комсамольцаў-учотчыкаў, якія павінны несьці перад ячэйкаю адказнасьць за ход вучотнай работы ў колгасе.

Лёзунгі: За здзельшчыну, за ўлік, за разьмеркаваньне прыбыткаў па колькасьці і якасьці працы—павінны стаць вядучымі і стрыжнем работы комсамольскай ячэйкі па гаспадарчаму ўмацаваньню колгасаў.

Кіруючыся прынцыпам, „хто больш і лепш працуе, той больш атрымоўвае" пры разьмеркаваньні ўраджаю, мы заб'ем кулацка-ядоцкі прынцып, узьдымем гаспадарчую моц колгасаў і новы, магутны прыліў.

Пролетарыят Ангельшчыны адказвае на законапроэкты „нацыянальнага" ўраду аб „экономіі"

ЛЁНДАН. 9. Надзвычайнае відовішча ўяўляла ўчора ноччу плошча перад памяшканьнем парляманту, шчыльна запоўненая шматтысячнай дэмонстрацыяй рабочых, якія прыйшлі з патрабаваньнем дапусьціць дэлегацыю на паседжаньне парляманту.

К 8-ай гадзіне ўвечары на плошчы перад памяшканьнем парляманту сабралася больш дзесяці тысяч рабочых са сьцягамі. Ня гледзячы на прысутнасьць тысячы конных і пешых паліцэйскіх, рабочыя пагражалі сілаю пракласьці шлях сваёй дэлегацыі ў парлямант.

Баявы настрой рабочых прымусіў уладу дазволіць дэлегацыі рабочых увайсьці ў парлямант. У чаканьні звароту дэлегацыі рабочыя ў вялікім хваляваньні запоўнілі прылежныя да плошчы вуліцы, поўнасьцю спыніўшы ў гэтай найбольш ажыўленай частцы гораду рух.

Да позьняе ночы дэмонстрацыя не разыходзілася. Каля 11-ай гадзіны, калі частка рабочых разышлася, паліцыя рашыла сілай разагнаць дэмонстрантаў.

На натоўп былі накіраваны 10 паліцэйскіх аўтомобіляў і конная паліцыя, якія пачалі палкамі зьбіваць рабочых. Сярод рабочых налічваецца шмат параненых. Тры чалавекі былі накіраваны ў больніцу і каля 70 чалавек арыштавана.

Паўстаньне ў Чылі задушана

Палявы суд расстрэльвае кожнага дзесятага

Чылійскі ўрад, перарваўшы перамовы з паўстаўшымі маракамі ў Кокімбо і Талкахуана, выдаў загад паветранаму флёту бомбардаваць паўстаўшыя ваенныя караблі.

80 ваенных аэропляна ў на працягу 30 хвілін скідалі бомбы на стаяўшыя ў гавані Кокімбо караблі. Крэйсэр „Охіггінс" і дзьве падводныя лодкі былі затоплены.

Урадавым войскам удалося разбурыць апошнія цытадэлі паўстанцаў.

Уся краіна знаходзіцца ў палоне самага жорсткага тэрору. Кожны дзесяты са зьняволеных у турме паўстанцаў расстраляны палявым судом. На 30 дзён быў абвешчаны стан аблогі.

Урад аддаў распараджэньне арыштаваць усіх комуністых і рэволюцыйных рабочых, якія маюць дачыненьне да паўстаньня і аддаць іх ваенна-палявому суду.

У большасьці гарадоў аб'яўлены ўсеагульныя забастоўкі ў знак протэсту супроць урадавага тэрору.

Амэрыканскі ўрад зьвярнуўся да ўраду Чылі з заявай, што ён будзе разглядаць паўстанцаў, якія хаваюцца на яго тэрыторыі, як піратаў а таму будзе іх выдаваць.

Дэмонстрацыя дзяцей у Амэрыцы супроць выкарыстоўваньня дзіцячай працы ў мэтах павялічэньня беспрацоўя сярод дарослых.

Зьнішчыць тормаз політвучобы—абязьлічку

Большасьць віцебскіх колектываў ЛКСМБ падыходзяць з прарывам да пачатку зімовай політвучобы

20 верасьня склікаецца культпроп нарада пры ЦК КП(б)Б аб разгортваньні зімовай політвучобы. Комсамольская організацыя да гэтай нарады прыходзіць з прарывам. Ня гледзячы на пастановы ЦК КП(б)Б аб разгортваньні зімовай політвучобы, якія адносяцца і да комсамольскай організацыі, яшчэ і дагэтуль у большасьці організацый політвучоба не разгорнута.

Галоўныя прычыны—опортуністычная недааценка і абязьлічка ў кіраўніцтве політвучобай.

Падрыхтоўка да зімовай політвучобы павінна ісьці па лініі выбару кожным комсамольцам адпаведнай формы вучобы, падрыхтоўкі памяшканьняў і забясьпечаньня літаратурай, а галоўнае падрыхтоўкі пропагандысцкіх кадраў праз курсы, сэмінары і г. д.

Уся гэтая работа павінна быць праведзена ў самыя бліжэйшыя дні. Комсамольская організацыя да нарады ЦК КП(б)Б павінна дабіцца зруху ў справе падрыхтоўкі да зімовай політвучобы.

Зрыўшчыкаў політвучобы—да адказнасьці

Комсамольскі колектыў заводу „Ноўка" падыходзіць з вялікім прарывам да зімняй політвучобы. Праваліўшы летнюю політвучобу, колектыў не падрыхтаваўся да зімовых заняткаў. 5 пазьменных політгурткоў зусім не працуюць, бо ў колектыве і у цэх'ячэйках няма адказнага за правядзеньне політвучобы.

Партыйны колектыў комсамольскім ячэйкам не дапамагае. З 60 партыйцаў ня могуць падабраць кіраўнікоў політгурткамі.

Сураскі РК ЛКСМБ, ня гледзячы на неаднакротныя сыгналы друку і ў прыватнасьці „Чырвонай Зьмены" ня прыняў ніякіх захадаў, каб наладзіць сваячасовы пачатак заняткаў у політшколах.

Брыгада „ЧЗ": Канончык, Крэсін.

Віцебскі комсамол дрэнна падрыхтаваўся да навучальнага году

—Не пазьней 15-га верасьня распачаць навучальны год у сетцы партыйнай асьветы па гарадох,—такая дырэктыва ЦК КП(б)Б. Аднак, Віцебская гарадзкая комсамольская організацыя, ня гледзячы на неабходнасьць уцягнуць у партшколы вялізарную колькасьць комсамольцаў, дрэнна падрыхтавалася да навучальнага году.

Каб ня быць галаслоўнымі, зьвернемся да фактаў.

На адным з акомсамоленых у асноўным колектываў гораду—заводзе „Чырвоны мэталіст" уцягненьне комсамольцаў у партшколы праходзіць з прарывам дрэнна. Пераважная большасьць комсамольцаў за выключэньнем навічкоў, якім даецца комсамольская зарадка не ахоплены політвучобай. АПО колектыву вакіраваны на цэлы месяц у вёску для правядзеньня асеньняй пасеўкампаніі. Ніхто яго не замяшчае і адказнага на політвучобу ў колектыве няма; адным словам тут—поўная абязьлічка.

Не адстаў ад комсамольскага колектыву „Чырвонага мэталістага" і колектыў чыгункі. Комсамольцы большасьці ячэек (тэбарнага цэху, паравозны) зусім не займаюцца політвучобай. У гэтым буйным колектыве, які ядна кала 5 ячэек няма апорабоґніка. Пытаньні зімовай політвучобы не абгавораны на колектыве.

Гарком комсамолу павінен як найхутчэй зрабіць круты перелом у падрыхтоўцы да навага навучальнага году.

Гаркому трэба ўлічыць прарыў у падрыхтоўцы да навучальнага ў горадзе і забясьпечыць сваячасовы пачатак заняткаў у вёсцы.

Сталёвы

Як організаваць праверку ўсваеньня політмінімуму

15 лістапада канчаецца тэрмін прапрацоўкі політмінімуму, устаноўлены ЦК УсеЛКСМ. К гэтаму часу ва ўсіх вясковых ячэйках неабходна правесьці праверку ўсваеньня політмінімуму.

Праверка і падвядзеньне вынікаў прапрацоўкі політмінімуму павінны прайсьці пад знакам яшчэ большага ўзмацненьня марксісцка-ленінскага выхаваньня і стаць асновай падрыхтоўкі да зімовай політвучобы. Політмінімум адыграў вялікую ролю. Аднак, прапрацоўкай політмінімуму політвучоба не заканчваецца, а наадварот—павінна прыняць больш шырокі размах і перайсьці на больш высокую ступень.

З 10-15 дзён да канца прапрацоўкі політмінімуму ва ўсіх ячэйках трэба скласьці праверачныя камісіі з прадстаўнікоў ячэек КСМ партячэек і райкомаў. У задачы праверачных камісій, акрамя праверкі ўсваеньня, уваходзіць падрыхтоўка да зімовай політвучобы. Камісія павінна праверыць на колькі ўсвоены політмінімум кожным комсамольцам, а ўсю пастаноўку політвучобы ў ячэйцы.

Як ячэйка організавала прапрацоўку політмінімуму, як кіравала школай і гуртком, ці забясьпечыла іх літаратурай і камсамольскімі сіламі.

Праверачныя камісіі абавязаны высьветліць, чым слухачы былі незадаволены і чаго патрабуюць яны, каб палепшыць політвучобу. Такой работай камісіі дапамогуць ячэйкі лепш організаваць політвучобу і прыстасаваць яе да пасобных груп комсамольцаў і моладзі. Лепшым вынікам праверкі ўсваеньня політмінімуму і работы праверачных камісій будзе організацыя новых школ і гурткоў да зімовай політвучобы.

Раённыя камітэты комсамолу абавязаны забясьпечыць кіраўніцтва праверкай політмінімуму. Лепшым, выпрабаваным мэтадам у праверцы павінна быць організацыя ячэйкавых і раённых політбояў, з прыцягненьнем лепшых ячэек, школ і пасобных комсамольцаў.

На гэтых політбоях трэба абгавараць вынікі прапрацоўкі політмінімуму і задачы вучобы на зімовы перыяд. Праверкі ні ў якім разе нельга пераўтварыць у экзамен. Праверка павінна прайсьці шляхам гутарак па ўсіх пытаньнях політмінімуму. Мэтавая ўстаноўка гэтых гутарак—не формальная праверка ведаў, а ўвязка політвучобы з вырашэньнем сучасных задач партыі і комсамолу.

Побач з ацэнкай пісьменнасьці кожнага слухача пасобку, камісія ў выніках павінна кожнаму комсамольцу параіць, дзе яму працягваць сваю вучобу, у якім гуртку і што далей чытаць.

Уся гэта праверка павінна паслужыць моцным штуршком да організацыі зімовай політвучобы. Зімовы перыяд павінен прынесьці пералом у організацыі вучобы вясковых комсамольцаў. Вясковыя організацыі абавязаны замацаваць зрух, зроблены ў працэсе прапрацоўкі політмінімуму.

Ф

Па-бальшавіцку разьмеркаваць прыбыткі!

Даць рашучы адпор кулацтву і яго агентуры правым апартуністым

Ударна рыхтуюцца

Правільная організацыя працы, укараненьне зьдзельшчыны і ўліку ў колгасах Селіцкага сельсавету, Пухавіцкага раёну, выклікала новую хвалю колгаснага прыліву. У выніку Селіцкі сельсавет колектывізаваны на 76 проц. Плян асеньняй сяўбы колгасамі ўжо выкананы на 80 проц. Ударна праходзіць абмалот збожжа і падрыхтоўка да разьмеркаваньня прыбыткаў. Комсамольскія ячэйкі колгасаў тлумачаць колгасьнікам рашэньні партыі і ўраду аб прынцыпах разьмеркаваньня ўраджаю па колькасьці і якасьці працы.

Р. М.

Даць руйнуючы адпор падкулачнікам

На сходзе колгасу „Прогрэс" Амельянаўскага сельсавету (Смалявіцкі раён) па запатрабаваньню колгасьнікаў разглядалася пытаньне аб абагульваньні яравога кліну. Загадчык колгаснай гаспадаркі заможнік Бацян, бачачы, што згодна жаданьню большасьці колгасьнікаў прыдзецца абагульваць ураджай, стараўся сарваць сход, кажучы: — „Пойдзем, гаспадары, няхай галыцьба застаецца". Цікава адзначыць, што гэтай агіднай вылазцы падкулачніка, партыйцы і комсамольцы, якія прысутнічалі на сходзе, не далі адпору. Бацян і зараз зьяўляецца загадчыкам колгаснай гаспадаркі.

Заможная частка колгасьнікаў на чале з Бацянам увесь час перашкаджае ўвядзеньню зьдзельшчыны. Зьдзельшчына ў колгасе праведзена толькі формальна. Няма ўліку колькасьці і якасьці работы кожнага колгасьніка. Авансы выдаюцца па дакох, а не па колькасьці працадзён. Колгасьнікі ня ведаюць, як будзе разьмяркоўвацца ўраджай і прыбыткі.

Падкулачніка Бацяна трэба гнаць з кіруючай працы ў колгасе. Адначасова комсамольская ячэйка павінна шырока растлумачыць колгасьнікам на аснове пастаноў партыі і ўраду прынцып разьмеркаваньня ўраджаю па колькасьці і якасьці работы кожнага колгасьніка.

Г. Хваёвы.

На повадзе ў кулака

У колгасе „Чырвоны маяк" Слуцкага раёну, спачатку ўборачнай кампаніі была праведзена значная работа па ўкараненьню зьдзельшчыны. На сходах колгасьнікаў абгавораны і складзены нормы выпрацоўкі.

Першыя дні работы пры зьдзельшчыне далі добрыя вынікі. Колгасьнікі, якія раней дрэнна працавалі, зараз ня толькі выконвалі, а ёй і перавыконвалі свае нормы. Шырока разгарнулася сярод колгасьнікаў спаборніцтва. Але, гэта было ў пачатку ўборачнай кампаніі. А што зараз?

Старшыня колгасу, убачыўшы, што ўсе колгасьнікі пры зьдзельшчыне працуюць па-ўдарнаму, супакоіўся. З гэтага часу перайшлі ад сыстэмы ўліку колькасьці і якасьці працы колгасьніка да „палачнай" сыстэмы, бо старшыня колгасу заявіў: „Усе ўдарнікі працуюць як мае быць, ніякай зьдзельшчыны ня трэба" (???) Такім чынам, ад зьдзельшчыны колгас перайшоў да падзёншчыны.

Гэта опортуністычная дзейнасьць старшыні колгасу ў пытаньнях організацыі працы знайшла свой адбітак і пры разьмеркаваньні кармоў.

Замест стварыць кармовы фонд для абагуленай жывёлы, фонд на час вясеньняй пасеўкампаніі і здаць дзяржаве заданьне, а потым ужо пачынаць разьмеркаваньне сярод колгасьнікаў па колькасьці працадзён кожнага, старшыня Пунчык зрабіў інакш. Ён кіраваўся кулацкім прынцыпам: перш сабе, а потым колгасу і дзяржаве. Пунчык загадаў, каб кожнаму колгаснаму двару выдалі па два вазы сена і па два вазы канюшыны.

Такая кулацкая політыка разьмеркаваньня прыбыткаў у колгасе прывяла да таго, што колгасная жывёла не забясьпечана кармовай базай.

Канончык.

Праз тры дні, па даручэньню комсамольскай ячэйкі, на сходзе колгасьнікаў комсамолец Сьвірыдаў рабіў інформацыю аб зьдзельшчыне.

Інформацыя была кароткай. Колгасьнікі сядзелі ціха, пільна пазіралі, сачылі за кожным гэстам прамоўцы.

— Таварышы колгасьнік! Зьдзельшчына зьяўляецца самай правільнай формай у організацыі працы. Пры зьдзельшчыне даходнасьць колгасьніка залежыць ад колькасьці і якасьці затрачанай працы. Кожны колгасьнік павінен устанавіць сваю цьвёрдую норму выпрацоўкі, выходзячы з вопытаў другіх колгасаў...

Сьвірыдаў гаварыў роўна, не гарачыўся, думка ўспрыймалася колгасьнікамі лёгка.

—Уся праца павінна расцэньвацца ў працаднях. Кожны колгасьнік павінен раней ведаць у колькі працадзён будзе расцэнена тая ці іншыя праца. Пагэтаму расцэнкі мы будзем абгаварваць на сходах. Брыгадзірам пры зьдзельнай працы патрэбна весьці дакладны ўлік работы кожнага колгасьніка. Улік дае мажлівасьць правільна разьмеркаваць прыбытак па колькасьці і якасьці затрачанай колгасьнікам працы.

Калі інформацыя была скончана, старшыня сход зьвярнуўся:

— Пытаньні якія будуць?

Адразу па кутках зашапталіся.

— Давайце, мужчыны, а то мы зараз маўчым, а потым будзем вышаўшы шаптаць!

— Што тут гаварыць?—басам завёў Пятроўскі.—Ведаем гэту зьдзельшчыну. Паслухайце, што ў маяку кажуць: мала гультаёў—давайце наробім болей, насадзім людзей, каб яны нам мералі, а потым падлічвалі. Ад паноў, як відаць, век не адкапаешся.

Пятроўскі глянуў сярдзіта на Сьвірыдава, буркануў сабе нешта пад нос і паціснуўся к парогу.

—Я хачу сказаць!—зьвярнулася да старшыні комсамолка Наста.

— Мужчынкі, зьдзельшчына нам дапаможа выйсьці з цяжкага становішча! з надрывам гаварыла яна.—А то ў нашым колгасе водзіцца так, хто адлыхае ў цяньку, а хто зусім на працу ня ідзе. Возьмем прыкладам жонку Пятроўскага: і аднаго дня ня вышла секць бульбу. Яшчэ многа такіх ёсьць, якія працаваць ня хочуць. А калі ўвядзем зьдзельшчыну, улік ды норму, будзем бачыць тады хто гультай.

— Праўду яна гаворыць,—пачуліся галасы.

— Таварышы, я толькі сяджу ды слухаю! Плёнку вы самі сабе майструеце,—устрывожана падхапіўся Лазарэвіч—Што-ж гэта? Колгас-фабрыка, што кожны дзень будзем стаяць пры адных станкох? Сёньня зранку я паеду араць, пазараў да поўдня, а там дождж; надвячоркам каля будынку працаваў. Дык мне толькі паўдня будуць лічыць, а астатні час дня я не працаваў выходзіць?

— Я ня ведаю чаго Лазарэвіч крычыць, ці ён не разабраўся, ці ня хоча разабрацца,—выступіў ужо досыць пажылы мужчына колгасьнік Мірон.— Нам падзякаваць трэба комсамольскай ячэйцы, што яна сёньня аб гэтым паставіла пытаньне. Гэта-ж я думаю, зразумела. Калі, прыкладам кажучы, Лазарэвіч паўдня араў (норма за дзень узараць $3/4$ дзесяціны, а ён узараў поўдзесяціны), дык яму пішаць па $3/4$ дня, а калі ён па абедзе рабіў другую работу, дык яму таксама запішуць.

— Скласьці сёньня брыгаду аратых,—прапанаваў комсамолец Валер.

— Згодны,—падхапіў сход.

* * *

З самага ранку складзеная на сходзе колгасьнікаў брыгада з васьмі парак выехала на поле. Перад тым, як распачаць працу, брыгадзір Сьвірыдаў адмераў удоўжкі 360 сажняў і ў шырькі 240.

— Вось, браткі, норма на кожнага; па тры чвэрткі дзесяціны! Сёньня нам трэба ўзараць гэты кусок,—зьвярнуўся ён да аратых.

— Многа, браткі, будзе!—падцягваючы карацей падстромкі заўважыў Антось.

— Гэта так толькі здаецца, бо ў адным куску. А разьбі яго на восем, дык паскольки тут давядзецца?—уздоўж і папярок кінуў вокам комсамолец Алесь.

— Склад я думаю зрабіць у гэтай баразьне, а тыя загоны ў роскідку прыкідаем,—заварочваючы коняй на першую баразну пачаў Сьвірыдаў.

— Давайце з гэтай—ззаду пачуўся голас.

— Я. Зазека

Урывак з аповесьці

Пашлі роўна, нібы адзін за адным, пакачваючы галовам коні. Плугі тупа чэркалі па дробных каменьнях.

— Глядзі там Павал, а то ў патаемнік нарогам залепіш!—крыкнуў Мікола свайму заднему суседу.

— Бачу, брат!—падняўшы плуг, адказаў Павал.—Гэта якраз на Мітавай паласе. Ты думаеш мала ён яму нарогаў паламаў?

А вецер мяккі, цёплы рахманы такі, плыве, зносіць у бок аваднёў, блытаецца ў грывах коняй, сушыць на бела вільготныя скіды воранай зямлі.

Восем баразён ёсьць,—павярачваючы к няй на адным месцы, узьнятым голасам загаварыў да аратых Сьвірыдаў.

— Давайце, хлопцы закурым!—супыняючы коняй прапанаваў Антось.

— Валі, валі Адну баразну прагнаў, ды стаянку хочаш рабіць? А на сваёй гаспадарцы, нябось, як працаваў дык у поўдзень адзін раз закурваў,—супярэчыць пачаў Павал.

— Дык гэта-ж дома было, што душыўся. А зараз на тое і колгас, каб чалавек мог лёгка працаваць,—сьцёбнуўшы пугай каня кінуў Антось здушаным голасам.

— Зусім не на тое організоўваюць колгасы, каб мала, альбо нічога не рабіць. Можа калі, і лёгка будзе, а зараз і папрацаваць прыдзецца як дома. перакоўваў Астап.

Восем парак завіхаючым крокам хадзілі ўздоўж поля. Восем чорных вільготных скіб, нібы расчэсаныя, радкамі чарнелі пасьля кожнага разу.

Добры дзень!—Калі ўжо выяжджалі на дарогу, лагодна-мяккім тонам спаткаў аратых Улас.

— Калі я адганяў каня, дык Мірон казаў, што вы сёньня зьдзельна працуеце.

— Але, брат! Просты рахунак; колькі я зарабіў толькі і мець буду. Не тое, што дагэтуль: хто і не працаваў дык усёроўна атрымоўваў,—тлумачыў Уласу Астап.

— Праўда, брат,—менш гультаёў будзе, Кожны будзе старацца рабіць як можа. А то-ж усе бачылі, як рабіў у колгасе Вінцэсь Люлвікаў, або Тамаш Захараў. Вясною каля нас араў Вінцэсь пад бульбу, дык праганіць баразну, а потым пэўня з паўгадзіны ляжыць на ўзьмежку.

Сьвірыдаў гэты час прабаваў ключом ці не адыйшлі ў плугох гайкі. Улас нерашуча паглядзеў на Сьвірыдава, потым падышоў да яго неяйкім ціхім голасам запытаў:

— А мой клін таксама араць будзеце?

— Потым. Ен пойдзе ўсуцэльную—трактарам узарэцца.

— Вы мусіць яго шкадуеце?—жартліва задаў пытаньне малады хлапец.

— Не, раней шкадаваў, бо кусок добры. Самы лепшы ён у мяне. Пшаніца як дым на ім расла. У мінулым годзе гною добра даў, бульба як галкі была, адна ў адну проста. Добры клін, але-ж колгас мусіў яго забраць, бо ён як скула пасярод вашага поля,—удумана гаварыў Улас.

— Ты, Улас разам з намі зьбіраўся уступаць,

Я нават помню ў каляды заяву табе быў напісаў,—напомніў Павал.

— Думаў, але-ж суседзяй паслухаў, засаромеўся Улас.

Вецер надрываючы дзьмуў, паласкаліся зялёныя копы нізкіх прыдарожных бяроз.

— Ну, адсапліся, Давай, сівыя!—пакрыкваў на коняй Сьвірыдаў.

Улас ішоў па дарозе. У яго галаве трымалася адна думка;

Колгас, зьдзельшчына, улік колькасьці і якасьці,—хто больш і лепш працаваў, той больш і атрымаў.

КОЖНАЯ „ДРОБНАЯ“ НЕПАЛАДКА—Б'Е ПА ВЫКАНАНЬНЮ ПЛЯНАЎ

Зьнішчыць абязьлічку—у гэтым задача дня

„Чырвоная Зьмена“ на „Полымя Рэволюцыі“

Плян быў абгавораны на бюро колектыву КСМ. Пасьля вылучэньня адказных брыгадзіраў чатырох „чырвоназьменаўскіх“ брыгад па барацьбе за рэалізацыю ўказаньняў Сталіна—змаганьне за гаспадарчы разрахунак, за правільную сыстэму аплаты працы, за організацыю працы ў цэху, за тэхнічную вучобу стала справай усяго комсамольскага колектыву.

Брыгады ўжо распачалі сваю працу. Троху нярухава, з нацяжкай уключаюцца ў працу брыгад заводзкія організацыі.

На агульна-заводзкай конфэрэнцыі—даклад тэхнічнага кіраўніка заводу аб выкананьні прамфінпляну. Адна з прычын н давыкананьня невыстарчальная кваліфікацыя новых рабочых, недастатковае разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва. На конфэрэнцыі ў спрэчках было прыведзена шмат падобных фактаў з працы заводу.

Праца „Чырвоназьменаўскіх“ брыгад павінна стаць справай усяго рабочага колектыву заводу.

Ліквідаваць прычыны прарываў

Дрэнная праца кавальнага цэху была прычынай шматлікіх прарываў на заводзе „Полымя рэволюцыі“. Кавальны цэх несваячасова даваў патрэбныя дэталі і выканаў прамфінплян на 52-60 проц. У цэху была вялікая цякучасьць рабочых, тут асабліва дала сябе адчуць ураўнілаўка ў зарплаце.

Перад цэхам паўстала задача ліквідаваць прарыў. Жнівень месяц стаў паказчыкам здольнасьці рабочага колектыву кавальнага цэху працаваць па-бальшавіцку. Крывая выкананьня прамфінпляну рэзка пайшла ўгару. Тэхнічнае кіраўніцтва перайшло з канторы ў цэх. Пачала раскачвацца і цэхпрофорганізацыя. За ліпень месяц у цэху было 123 прагулы, за жнівень 7. У ліпені 12 спазьненьняў, у жніўні ніводнага.

Перагляд расцэнак даў значныя вынікі. Павысілася вытворчасьць працы і заработная плата. У ліпені сярэдняя заработная плата раўнялася 160 р., у жніўні — 199 р. Прамфінплян за жнівень выканан на 120 проц.

У кавальным цэху было тры комсамольцы. Зараз—17. У кавальным цэху організуецца свая комсамольская ячэйка. Лепшыя ўдарнікі цэху прэміяваны за ўдарную працу: тав. Жыгалка, Лебедзінскі, Корзік.

Шлях кавальнага цэху ў барацьбе за выкананьне прамфінпляну павінен стаць прыкладам для астатніх цэхаў заводу і для астатніх прадпрыемстваў.

Перад кавальным цэхам стаяць яшчэ сур'ёзныя задачы. Яшчэ і зараз іншыя цэхі заводу скардзяцца на дрэнную якасьць продукцыі кавальні, яшчэ і зараз балты з-за дрэннае нарэзкі ідуць у брыгаду ўтылю. Яшчэ быў выпадак, калі каваль Лісіцын замазаў трэшчыну ў рысорах з тым, каб брак пусьціць у ход.

Зараз неабходна ўключыцца ў барацьбу „чырвоназьменаўскіх“ брыгад за ажыцьцяўленьне прамовы Сталіна з тым, каб зьнішчыць недахопы ў працы асноўнага цэху заводу.

Уладзімер.

Рэалізацыяй рабочых прапаноў ліквідаваць тэхнічныя непаладкі ў беладрэўным цэху

Правільнае скарыстаньне мэханізмаў—парука перамог

„Чырвоная Зьмена на бабруйскім комбінаце“

Адным з вузкіх месц у рабоце маладзёжнага Белцэху ў свой час зьяўлялася сушка сырых матар'ялаў. Зараз, у зьвязку з пераходам на сушку дэталяй, гэта вузкае месца амаль ліквідавана. А вось процэс раскройкі і падачы дэталяй на за-

ханізаваны ў такой меры, як увесь цэх, які абсталяваны па апошняму слову тэхнікі. Сырыя дошкі ваганэткай падаюцца праз усе шляхі на 2 паверх, там раскройваюцца і, зноў нагружаныя, ваганэткі спускаюцца ўніз, і падаюцца ў сушылкі, а потым зноў падымаюцца наверх, дзе пасьля сартоўкі ідуць у далейшую апрацоўку.

Каб спыніць гэты шалёны вір сырых і сухіх дэталяй, трэба наставіць чацьверты ліфт, альбо перанесьці 4-х баковы стругальны варштат, які знаходзіцца ў Бельцэху, мае ліфт і амаль не скарыстоўваецца ім, а працуе для стандартнага і інш. цэхаў. Гэты варштат можа быць лёгка перанесен у другі цэх, а ліфт павінен быць скарыстаны для дастаўкі сухіх дэталяй.

Такое мерапрыемства, бязумоўна, унясе вялікі пералом у падачу матар'ялаў. Яго патрэбна ажыцьцявіць у бліжэйшыя дні. Побач з гэтым трэба пашырыць у цэху вузкакалейку для больш хуткай і лёгкай перадачы матар'ялаў.

На месца зьнятага варштата паставіць 2 пілы для ўтылізацыі адыходаў, якія зараз надзвычайна загружаюць увесь цэх і не скарыстоўваюцца. Гэта мерапрыемства будзе першым крокам у організацыі ўтылізацыйнага цэху.

Фанера для філёнак дастаўляецца ў Белцэх не аднолькавай таўшчыні. Гэта—вялікі тормаз у працы і дае брак, бо цэх працуе па стандартах. Фанера павінна дастаўляцца аднаго пэўнага размеру.

Ано з вузкіх месц маладзёжнага цэху—гэта транспорт. Не хапае чатырох калёсных, пад'ёмных і столікавых ваганэтак. Рад ваганэтак патрабуе рамонту, але гэта ўпіраецца ў работу мэханічнай майстэрні.

Мэханічная майстэрня пры Белцэху ні ў якім разе ня можа забясьпечваць яго запатрабаваньні. Так, цэху надзвычай патрэбен фрэзэр па мэталю. Цэлы год аб гэтым гавораць, а фрэзэра яшчэ няма.

Майстэрня не забясьпечана ў дастатковай ступені кваліфікаванымі мэнцёрамі і сьлесарамі. Падрыхтаваць такія кадры амаль ніхто ня думае. І вось, кожную дробязь пры-

ходзіцца рамантаваць у агульнай майстэрні комбінату, што значна зацягвае рамонт і выклікае вялікія прастоі паасобных варштатаў.

Трэба мобілізаваць унутраныя рэсурсы ня толькі комбінату, але і іншых організацый і за гэты кошт пашырыць мэханічную майстэрню белцэху.

Цэх дрэнна забясьпечваецца сыравінай. Гаспадарнікі тлумачаць гэта адсутнасьцю транспорту. Між тым на комбінаце ёсьць некалькі аўтавозаў.

Патрэбна зараз-жа патурбавацца аб тым, каб забясьпечыць цэх вусенічным трактарам для дастаўкі сыравіны ўзімку.

Пры правільнай організацыі працы, барацьбе з цякучасьцю рабсілы, праз замацаваньне рабочых, узьняцьце іх тэхнічнага ўзроўню—мы зьнішчым прарывы, якія яшчэ да гэтага часу мае белцэх.

Генкін Каганская

У паход за клясава-сьвядомае і пісьменнае папаўненьне РСЧА

БАБРУЙСКІ ГАЛАЎНЫ СТАМІЎСЯ...

ПУХАВІЦКІ РК ЗАБЛЫТАЎСЯ Ў ПАВУЦІНЕ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ

У ДНІ ПРЫЗЫВУ—УЗВЫШАЦЬ ТЭМПЫ ПАХОДУ!

ПАЗБАВІЦЬ ПАХОД АД ОПОРТУНІСТЫХ!

Усебеларускі паход за клясава-сьвядомае папаўненьне РСЧА ўступіў у адказьнейшую паласу работы па правядзеньню прызыву 1909 году. Ня ўсе комсамольскія організацыі забясьпечылі баявыя тэмпы паходу. Далёка ня ўсе комсамольскія організацыі ўразумелі грандыёзныя задачы прызыву.

Бабруйскі галаўны атрад, які некаторы час таму назад ня дрэнна пачынаў разгортваць паход, цяпер напярэдадні 15-га верасьня,—першага дня прызыву ў Бабруйску, ганебна здаў свае позыцыі, ня выканаўшы ніводнай задачы паходу. Пухавіцкая комсамолія ня гледзячы на шматлікія сыгналы „Чырвонай Зьмены“ і „Чырвонаармейскай Праўды“, прышла да дня прызыву—13 верасьня непадрыхтаванай. Гэта ўзоры опортуністычнай недаацэнкі задач прызыву, гэта абураючыя прыклады таго, як ня трэба выконваць дырэктывы ЦК ЛКСМБ і задачы абароннай работы.

Мы патрабуем ад ЦК ЛКСМБ прыцягненьня да адказнасьці кіраўніцтва Бабруйскай і Пухавіцкай організацыі ЛКСМБ. Комсамольскія організацыі павінны ўлічыць урок Бабруйску і Пухавіч.

Распачынаючы работу у прызыўных пунктаў, патрэбна па-баявому працягваць работу па выкананьню задач прызыву. На прызыўны пункт прызыўнікі павінны ісьці з Чырвоным абозам, з рапартамі барацьбы за пяцігодку. Ліквідацыю няпісьменнасьці і малапісьменнасьці прызыўнікоў, барацьбу за 40 проц. комсамольскую праслойку прызыву і г. д. Трэба весьці да апошніх дзён адпраўкі прызыўнікоў у часьці.

Прыцягнуць Пухавіцкі РК—да адказнасьці

„Чырвоная Зьмена“ і „Чырвонаармейская Праўда“ не раз сыгналізавалі аб тым, што ў Пухавіцкім раёне падрыхтоўчая работа да прызыву 1909 г. нараджэньня не разгорнута. Сыгналы ў друку ня ўлічаны ў Пухавічах.

13 верасьня ў Пухавічах першы дзень прызыву, алё раённыя партыйныя і комсамольскія організацыі не мобілізавалі ўсе свае сілы на пасьпяховае ажыцьцяўленьне задач пастаўленых РВС БВО.

Вораг праламіць у рады РСЧА, імкнецца напружыць усе свае сілы, але Гарэліцкі, Блоньскі, Блужскі, Пудзіцкі сельсаветы ніякай работы па клясаваму адбору не правялі.

РК ЛКСМБ навет ня ведае аб рашэньні ЦК аб тым, што 40 проц. прызываемых у рады Чырвонай арміі павінны быць комсамольцамі.

Рыг. Малаток.

Прызыў надыходзіць, а работа адсутнічае

Комсамольская ячэйка Паддабранкі Церахоўскага р-ну зусім забылася аб тым, што набліжаецца прызыў 1909 г. Ніякай работы сярод прызыўнікоў яна не праводзіць. Некалькі дзён таму назад комсамольскай ячэйкай і ячэйкай АСОАвіяхэма былі праведзены вайсковыя заняткі. Комсамольцы і частка АСОАвіяхэмаўцаў былі папярэджаны аб гэтым, але прызыўнікі нічога ня ведалі. Таксама і на стрэльбішчах прызыўнікі застаюцца ў баку.

Наогул ячэйка не зацікаўлена правядзеньнем якой-небудзь работы сярод прызыўнікоў.

Прызыўнік.

Вышэй тэмпы!

25-га жніўня ў Добрушы на масоўцы комсамолу адбыўся мітынг аб задачах росту комсамола і аб падрыхтоўцы да прызыву.

25-га адбылася конфэрэнцыя прызыўнікоў, на якой дзевяць прызыўнікоў падалі колектыўную заяву ў комсамол. Комсамольскі колектыў мала ўдзяліў увагі прызыву.

Трэба па-баявому ўзяцца за работу. Партколектыў і заўком не цікавяцца прызывам, яны думаюць, што гэта справа комсамола, а ня іх.

Круглянскі.

Прарывы.., прарывы...

15-га верасьня у Бабруйску распачынаецца прызыў 1909 году. Да гэтага дня не разгарнута баявой падрыхтоўчай работы.

Ваенкаматам разам з брыгадамі РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ праведзены у сельсаветах і ў горадзе конфэрэнцыі прызыўнікоў. Праведзена праверка падрыхтоўчай работы да прызыву. З большасьці сельсаветаў і прадпрыемстваў прадстаўлены сьпісы і характарыстыкі прызыўнікоў, але гэтыя характарыстыкі не абгаворваны на сходах рабочых і колгасьнікаў. Гэта сьведчыць аб тым, што клясавы адбор праходзіць дрэнна.

На некаторых прадпрыемствах нават ня ведаюць аб дню прызыва (завод імя Сталіна). На мэблявай фабрыцы, самтрэсме і ў паасобных сельсаветах яшчэ зусім не разгорнута работа вакол задач прызыву.

Профсаюзныя організацыі знаходзяцца у баку ад усіх мерапрыемстваў па правядзеньню прызыўнай кампаніі. Саюз Працаасьветы абмежаваўся тым, што пры падвядзеньні вынікаў мінулага навучальнага году запісаў у пастанове аб неабходнасьці ліквідацыі няпісьменнасьці сярод прызыўнікоў. Гэтая пастанова ня выканана. Райполітінспэктарыят не праверыў выкананьне сваіх дырэктыў.

На сёньнешні дзень 30-40 прызыўнікоў няцісьменныя. Большасьць прызыўнікоў ліквідавалі толькі няпісьменнасьць, аднак пытаньню ліквідацыі малапісьменнасьці аддаецца мала ўвагі.

Масава-растлумачальная работа задач прызыву праведзена невыстарчальна. З-за гэтага з боку прызыўнікоў ужо маюцца выпадкі ўходу з вытворчасьці (на заводзе імя Сталіна прызыўнік Шчэрбіч пакінуў працу). Заводзкія організацыі ніякіх мер па замацаваньню прызыўнікоў на працы да апошняга дня адпраўленьня ў часьць ня прымаюць.

Трэба неадкладна разгарнуць шырокую растлумачальную работу задач прызыву. Да ўсёй работы трэба прыцягнуць шырокія колы пролетарскай грамадзкасьці. Дні прызыву трэба ператварыць у дэмонстрацыю вытворчых і колгасных дасягненьняў, організуючы чырвоныя абозы, ударныя брыгады імя прызыву і г. д. Бабруйская комсамолія, якая вызначана галаўным атрадам у паходзе, павінна неадкладна ліквідаваць дапушчаныя прарывы.

П. Гузікаў.

ЮНКОР-УДАРНІК, ПАМЯТАЙ!

14-га верасьня, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“ (Карла Маркса, 38)

адбудзецца шырокая нарада юнкораў-ударнікаў

па організацыі рэйду праверкі выкананьня пастаноў ЦК УсеКП(б) аб палепшаньні грамадзкага харчаваньня і стану загатовак плодагародніны.

На нараду павінны зьявіцца юнкоры заводаў: Варашылава, Камунара, Полымя рэволюцыі; фабрык: Комунаркі і Кастрычніка; МШУ, ФЗВ, КІМ і Хэміка-Тэхнолёгічнага Тэхнікуму. Яўка абавязкова.

Орг. масавы сэктар „Чырв. Зьмены“

Аб разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў колгасах у 1931 г.

Пастанова Наркамзему і Колгасцэнтру БССР

Канец, пачатак гл. „ЧЗ“ № 212.

г) выдача продуктаў харчаваньня ўсім пералічаным у п. 4, № „а“, „б“ і „в“ праводзіцца па мясцовых дзяржаўных цэнах, аднак, у выпадку вялікай патрэбы паасобных сем'яў колгасьнікаў, якія добрасумленна працавалі ў колгасе і маюць вялікую колькасьць непрацаздольных, харчовыя продукты са спэцыяльнага харчовага фонду, па пастанове агульнага сходу колгасьнікаў, могуць быць выданы ў парадку выключэньня бясплатна. Гэтыя выдаткі сьпісваюцца з даходаў колгасу, як беззваротныя выдаткі гаспадаркі.

5. Уся маса харчовых продуктаў, за вылікам зданай (праданай) па загатоўках, адкладзенай у насенны, страхавы і спэцыяльныя харчовыя фонды, разьмяркоўваюцца паміж колгасьнікамі па колькасьці і якасьці працы, згодна выпрацаваных працадзён, якія запісаны ў працоўных кніжках колгасьнікаў.

6. Калі колгасьнік, працуючы добрасумленна на працягу году, выпрацаваў шмат працадзён, і харчовыя продукты, якія належаць да атрыманьня такім колгасьнікам у лік выпрацаваных працадзён перавышаюць уласную патрэбу гэтых колгасьнікаў і іх сем'яў у харчох, дык лішак гэтай продукцыі павінен быць здан колгасьнікамі ў організаваным парадку праз колгас адпаведным дзяржаўным або кооперацыйным організацыям, а колгасьнікі за праданыя належачыя ім лішкі атрымліваюць грошы і прамтавары.

7. На падставе папярэдняга пляну разьмеркаваньня даходаў у колгасах, па меры выкананьня пляну ўборкі і здачы па загатоўках, колгасьнікам выдаюцца авансы харчовымі продуктамі ў лік выпрацаваных ім працадзён. Выдача авансаў павінна праводзіцца ў наступным парадку:

а) з агульнай колькасьці сабранай ужо харчовай продукцыі ў часе правядзеньня папярэдняга разьмеркаваньня ўраджаю, праўленьне колгасу вызначае частку для авансаваньня колгасьнікаў разьмеры, які ні ў якім разе не павінен перавышаць $^2/_3$ таго, што па папярэднім падліку павінна быць разьмеркавана паміж колгасьнікамі;

б) вызначыўшы пэўную колькасьць харчовай продукцыі для авансаваньня колгасьнікаў, праўленьне колгасу, на падставе дасканалага падліку выпрацаваных усімі колгасьнікамі да часу раздачы авансаў працадзён, устанаўляе колькасьць харчовай продукцыі, якая прыпадае ў якасьці авансу на 1 працадзень;

в) вызначаныя для разьмеркаваньня ў якасьці авансаў паміж колгасьнікамі харчы разьмяркоўваюцца па колькасьці выпрацаваных кожным колгасьнікам працадзён;

г) праўленьні колгасаў могуць не выдаваць авансаў тым колгасьнікам, якія дрэнна працуюць і ня выконваюць заданьня праўленьняў, а адкладваюць разьлікі з гэтымі колгасьнікамі да сканчэньня ўсіх работ.

8. Пасьля выдачы авансаў у кожным колгасе павінны вывешвацца сьпісы колгасьнікаў з паказаньнем, колькі кожны колгасьнік або колгасная сям'я выпрацавалі працадзён і які разьмер авансу ў адпаведнасьці з гэтым яны атрымалі.

5. Разьмеркаваньне кармовай продукцыі

1. Кармовая продукцыя колгасаў разьмяркоўваецца так:

а) выконваецца плян здачы (продажу) дзяржаве кармоў па плянах загатовак, устаноўленых для кожнага колгасу ў паасобку;

б) ствараецца фуражны фонд грубых і концэнтраваных кармоў для поўнага забясьпечаньня патрэбнасьці таварных колгасных фэрм, рабочай і грамадзкай продукцыйнай жывёлы колгасаў, асабліва на гадоўлю маладняка і запасны фуражны фонд для намечанага пашырэньня жывёлагадоўлі як у таварных колгасных фэрмах, так і іншай грамадзкай жывёлы. З фонду, прызначанага для грамадзкай жывёлы, павінна быць выдзелена недатыкальная частка для рабочай жывёлы на час падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы; гэта частка захоўваецца асобна і выдаткоўваецца толькі з пачаткам веснавых палявых работ.

Кармы, вызначаныя для таварных колгасных фэрм, бранююцца за таварнымі фэрмамі і могуць выдаткоўвацца толькі на патрэбы фэрмы;

в) ствараецца спэцыяльны кармовы фонд для забясьпечаньня кармамі жывёлы колгасьнікаў-адыходнікаў, сем'і якіх, з прычыны невыстарчальнай колькасьці працаздольных, ня выпрацавалі колькасьці працадзён, неабходнай для атрыманьня кармоў у разьмеры, які забясьпечвае іх жывёлу. Разьмер гэтага фонду павінен быць такім, каб адыходнікі атрымалі кармоў столькі для жывёлы, колькі атрымае колгасьнік, які дабрасумленна працуе ў колгасе. Калі працаздольныя члены сям'і адыходнікаў адмаўляюцца зусім ад работы ў колгасе, або сыстэматычна прымаюць невыстарчальны ўдзел у рабоце пры наяўнасьці выстарчальнай колькасьці працаздольных, дык сям'я адыходніка гэтай ільготай не карыстаецца і атрымлівае кармы для жывёлы толькі ў той колькасьці, якая прыпадае на выпрацаваныя членамі сям'і адыходніка працадні. Кармы з гэтага фонду для жывёлы адыходнікаў адпускаюцца за наяўны разьлік па ўстаноўленых дзяржаўных цэнах;

г) усе кармы, якія застаюцца пасьля выкананьня пляну загатовак, стварэньня фуражнага, запаснога і спэцыяльнага кармовых фондаў, разьмяркоўваюцца паміж колгасьнікамі, якія маюць продукцыйную жывёлу па колькасьці выпрацаваных колгасьнікамі працадзён з улікам наяўнасьці ў колгасьнікаў продукцыйнай жывёлы;

д) колгасьнікі, якія ня маюць продукцыйнай жывёлы, атрымліваюць належачую ім долю даходаў замест фуражу грашыма;

е) колгасьнікі, які заведзе продукцыйную жывёлу пасьля разьмеркаваньня ўраджаю, можа атрымаць неабходную колькасьць кармоў за плату па дзяржаўных цэнах, адпаведна выпрацаванай ім колькасьці працадзён, з запаснога фуражнага фонду па асобнай пастанове праўленьня колгасу.

6. Разьмеркаваньне грашовай часткі даходаў

1. Грашовы даход колгасаў складаецца з:

а) здачы (продажу) дзяржаве харчовай, кармовай і іншай продукцыі, у тым ліку ад рэалізаванай продукцыі таварных фэрм;

б) кошту выданай продукцыі са спэцыяльнага харчовага фонду і кармовага фонду;

в) даходаў ад прамысловых і падсобных прадпрыемстваў;

г) даходаў ад паасобных заработкаў;

д) іншых грашовых даходаў колгасаў.

2. Крэдыты і грашовыя авансы па контрактацыі ў грашовы даход, які падлягае разьмеркаваньню, ня ўключаецца.

3. Грашовыя даходы колгасу павінны разьмяркоўвацца наступным чынам:

а) выплачваецца с-г. падатак, страхоўка і іншыя абавязковыя плацяжы;

б) пагашаюцца пазыкі па крэдытах, якія неабходна аплаціць у 1931 годзе;

в) утрымліваюцца спэцыяльныя і грамадзкія фонды, якія ствараюцца згодна §§ 2, 3, 4, 5 і 6 разьдзелу 3;

г) пагашаюцца вытворчыя, адміністрацыйна-гаспадарчыя і агульныя выдаткі колгасу;

д) уся рэшта сумы пасьля правядзеньня гэтых адлічэньняў разьмяркоўваецца паміж колгасьнікамі адпаведна колькасьці працадзён, выпрацаваных кожным колгасьнікам і запісаных у яго працоўную кніжку.

7. Організацыйныя мерапрыемствы

1. Уся работа па падрыхтоўцы і разьмеркаваньню даходаў павінна праводзіцца пры актыўным удзеле ўсіх колгасьнікаў і колгасьніц. Папярэднія і канчатковыя пляны разьмеркаваньня павінны быць шырока абгавораны і зацьверджаны агульным сходам.

НКЗ і Колгасцэнтр БССР папярэджваюць усе праўленьні колгасаў, колгассаюзы, зямельныя аддзелы і МТС супроць спроб праводзіць разьмеркаваньне даходаў і ўраджаю колгасаў адміністрацыйным парадкам, паменшваючы актыўнасьць і самадзейнасьць шырокіх колгасных мас.

2. Папярэднія і канчатковыя вынікі разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у колгасах трэба ставіць на абгаварэньне не толькі агульных сходаў колгасьнікаў, але і на шырокіх сходах беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў, з тым каб на аснове даных разьмеркаваньня даходаў у колгасах паказаць аднаасобнікам усе перавагі буйной колектыўнай гаспадаркі, перад дробнай аднаасобнай.

3. Наркамзем і Колгасцэнтр БССР абавязваюць колгассаюзы, зямельныя аддзелы і МТС для аказаньня рэальнай дапамогі праўленьням колгасаў і кіраўніцтва ў справе падрыхтоўкі і разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў прымацаваць да групы 5-10 колгасаў па аднаму адказнаму работніку са складу зямельнага аддзелу, колгассаюзу і МТС і іншых раённых організацый, якія добра вывучылі прынцыпы і тэхніку разьмеркаваньня даходаў, усклаўшы на іх адказнасьць за правядзеньне работ па падрыхтоўцы і разьмеркаваньню даходаў у прымацаваных колгасах.

4. Абавязаць зямельныя аддзелы, колгассаюзы і МТС вылучыць у кожным сельсавеце па аднаму апорнаму колгасу пераважна з спэцыялізаваных, і правесьці ў гэтых колгасах у першую чаргу работу па папярэдняму разьмеркаваньню ўраджаю з тым, каб на іх вопыце організаваць работу ў іншых колгасах раёну.

5. Даручыць колгассаюзам скарыстаць усіх грамадзкіх па-заштатных інструктароў і дадаткова вылучыць са складу старых колгасаў лепшых колгасьнікаў-ударнікаў, якія добра зразумелі прынцыпы і тэхніку правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю, у якасьці грамадзкіх інструктароў з такім разьлікам, каб на кожныя 5 колгасаў прыходзілася ня менш, як па аднаму інструктару.

6. Наркомзем і Колгасцэнтр БССР папярэджваюць, зямельныя аддзелы, колгассаюзы, МТС і праўленьні колгасаў, што затрыманьне з разьмеркаваньнем ураджаю і даходаў, адсутнасьць і дрэнны ўлік ураджаю і асабліва колькасьці і якасьці выпрацаваных колгасьнікамі працадзён а таксама невыстарчальнае правядзеньне растлумачальнай работы сярод шырокіх мас колгасьнікаў будуць разглядацца, як самае цяжкае злачынства, накіраванае на зрыў справы правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю, і як дапамога кулаку ў яго рабоце супроць непераможнага колгаснага руху.

7. Наркомзем і Колгасцэнтр БССР падкрэсьліваючы, што толькі правільнае разьмеркаваньне даходаў у колгасах умацуе зьдзельшчыну і завяршыць вялізарную работу, прароблёную ў час веснавой і ўборачнай кампаніі, яшчэ раз напамінае ўсім колгасьнікам і колгасьніцам, што толькі на аснове правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю па працадзёх, на аснове зьдзельшчыны, будзе нанесен рашучы ўдар кулаку і яго імкненьням разбураць колгасы шляхам разьмеркаваньня даходаў па ядоцкай ураўнілаўскай сыстэме. Толькі на аснове правільнага разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю, будзе далей разгортвацца непераможны колгасны рух, будзе сапраўды дасягнута гаспадарчае ўмацненьне колгасаў.

Народны Камісар земляробства
Рачыцкі
Старшыня Колгасцэнтру БССР
Міцькоў

У бой за 500 і 350.000

На барацьбу з бездарожжам уздымем мільёны працоўных

Паводле пастановы ЦК КП(б)Б 15 верасьня распачынаецца ўсебеларускі месячнік па барацьбе з бездарожжам. Асноўныя задачы месячніку—мобілізаваць шырокія колы партыйных, комсамольскіх, профэсыянальных організацый і ўсей пролетарскай грамадзкасьці на барацьбу з бездарожжам, на выкананьне пляпаў дарожнага будаўніцтва.

Комсамолія Беларусі ўжо выйшла ў паход на барацьбу з бездарожжам. Створаны пры „Чырвонай Зьмене“ ўсебеларускі штаб кіраўніцтва разгарнуў сваю работу. Памятаючы, што правядзеньне месячніка, абвешчанага ЦК КП(б)Б непарыўна зьвязана з комсамольскім паходам па барацьбе з бездарожжам, організацыі ЛКСМБ абавязаны ў часе месячніку разгарнуць баявую работу, каб выканаць узятыя на сябе абавязацельствы—паправіць 500 кілёмэтраў дарог і насадзіць 350000 дрэў.

Гэтыя абавязацельствы будуць выкананы толькі тады, калі на гэтую справу будзе мобілізавана ўся комсамолія і працоўная моладзь, калі будуць разгорнуты сапраўды бальшавіцкія тэмпы па правядзеньню абвешчанага ЦК КП(б)Б месячніку.

На штурм бездарожжа

(З пастановы ЦК КП(б)Б аб месячніку штурму дарожнага будаўніцтва)

1. Абвясьціць з 15 верасьня па 15 кастрычніка месячнік штурму дарожнага будаўніцтва, прыцягнуўшы да актыўнага ўдзелу ў правядзеньні месячніка шырокія колы пролетарскае грамадзкасьці і працоўных вёскі.

2. У якасьці цэнтральнай задачы месячніка паставіць ліквідацыю прарыву ў дарожнай будаўнічай програме г. г., узмацненьне работ па дар. будаўніцтву і палепшаньне дарог мясцовага значэньня ў парадку ажыцьцяўленьня закону аб працоўнай дарожнай павіннасьці.

3. Гаркомам і райкомам КП(б)Б узяць пад сваё кіраўніцтва правядзеньне месячніка, мобілізуючы профэсыянальныя, комсамольскія і грамадзкія організацыі для правядзеньня вярбоўкі рабочых і масавых суботнікаў па ліквідацыі прарыву на дарожным будаўніцтве, вывазкі каменьня, рассыпкі шчэбеню і іншых будаўнічых работ.

Гэты месячнік гаркомы і райкомы павінны выкарыстаць для праверкі максымальнага разгортваньня дзейнасьці аўтадораўскіх дарожных організацый у горадзе і вёсцы.

Комсамольцы на штурм бездарожжа

Пухавіцкі раённы камітэт комсамолу мобілізаваў на дарожнае будаўніцтва сярод астатніх комсамольцаў комсамолку Міну Плакс. У сувязі з бытавымі і матар'яльнымі ўмовамі бюро гаркому пастанавіла вызваліць яе ад мобілізацыі.

Ня гледзячы на гэта, тав. Плакс дабраахвотна паехала на работу і па сёньня працуе там ударна.

Х.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб школе ў дзеяньні

СЛОВА АСЬВЕТНІКАЎ МЕНСКУ

11-га верасьня ў Доме Працасьветы адбыўся агульнагарадзкі зьлёт асьветнікаў-ударнікаў Менску прысьвечаны рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб ніжэйшай і сярэдняй асьвеце і заключэньню соц. мовы асьветнікаў г. Менску з асьветнікамі гораду Смаленску Заходняй вобласьці.

З дакладам аб рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) выступіў тав. Заранбоўскі, (ЦП Працасьветы).

Карэнны недахоп нашае школы—гэта тое, што яна дае слабую агульна-адукацыйную падрыхтоўку. Політэхнізацыя праводзіцца часта формальна, абстрактна. Цэнтральны камітэт партыі зьвярнуў асаблівую ўвагу на політэхнізацыю школы. Пры школах трэба організаваць майстэрні, рабочыя пакоі, злучыўшы школы з прадпрыемствамі, колгасамі і саўгасамі. Уся грамадзка-вытворчая праца павінна быць падпарадкавана на выкананьне гаспадарча-політычных задач у школе.

Трэба адзначыць, што мэтодычнае кіраўніцтва ў нас з рук вон дрэннае. Да 1932 году програмы павінны быць выпрацаваны. Навукова-дасьледчыя ўстановы, у прыватнасьці інстытут партыйна-комуністычнага выхаваньня, павінны прасоўваць свой вопыт політэхнічнае асьветы ў нашы школы. ЦК УсеКП(б) зьвярнуў асаблівую ўвагу на забясьпячэньне настаўніцтва. Мы павінны ў сучасны момант асабліва заахвочваць настаўніка ўдарніка.

У спрэчках выступіла 12 настаўнікаў-ударнікаў.

—Мы павінны браць прыклад, кажуць асьветнікі-ударнікі з Масквы, Кіеву, Харкаву, Ленінграду, дзе пастанова ЦК УсеКП(б) у ў дзеяньні. Там маса узьнята, але гэтага мы не наглядаем у Менску. Комсамол, як шэф усеабучу ў гэтай галіне зрабіў мала. Органы Асьветы павінны перабудаваць сваю работу. Шмат прадпрыемстваў Менску ня хочуць заключаць соцумоў па політэхнізацыі. Наркамасьвет не забясьпечыў школ кадрамі.

Пытаньне аб аўладаньне тэхнікай сярод асьветнікаў амаль не праапрацавана. Тое-ж самое і з боку ЦП Саюзу. Настаўніцтва Беларусі ахоплена толькі на 32 проц. ударніцтвам у той час, як рабочыя ахоплены на 70—75 проц. Настаўнікі павінны ісьці разам з рабочымі

Асьветнікі Менску абавязаліся.

—Выканаць і перавыканаць плян культурнага будаўніцтва.

—Давесьці да кожнага рабочага, колгасьніка і рабочага саўгасаў пастанову ЦК УсеКП(б) аб ніжэйшай і сярэдняй школе.

Школам заключыць дагавор з прадпрыемствам, дабіўшыся сапраўднае політэхнізацыі школы.

—На працягу аднэй дэкады вылучыць 50 настаўнікаў ударнікаў для перапрацоўкі мэтодычных программ і прагляду падручнікаў.

—Вылучыць 15 асьветнікаў ударнікаў у дапамогу мэтадычнага кіраўніцтва Гор. Інспэктарыяту Асьветы.

—Распрацаваць соцумову ЦП Саюзу Працасьветы Беларусі, заключаную з Заходняй вобласьцю.

Міхась Раніта

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ.

Друкарня ім. тав. Сталін

Галоўлітбел № 599